Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 1 (109) Серада 11-га студзеня 1928 г. м. Вільня. Год III.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньне. — [...]-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократызм.—Барацьба з н[...] царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
" " 3 " 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
" У тэксце . —40 гр.
" На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

НАШ ВЫБАРНЫ ШЛЯХ.

Беларускія партыі разьбіліся на тры групы, якія па рожнаму ідуць на выбары.

Першай групай, якая больш месяца назад зарганізавала „Цэнтральны Аб'еднаны (?) Беларускі Выбарны Камітэт", ёсьць старая кампанія Сельсаюзьнікаў, другачарговых хадэкаў (лідэраў кс. А. Станкевіча і кс. Гадлеўскага там няма!) і праваслаўнага дэмократычнага аб'еднаньня (зноў аб'еднаньне!) якое з'еднывае ажно дзьве асобы — б. сэнатара Багдановіча і забароненага сьвяшчэніка Голада. Гэты „аб'еднаны" камітэт. як ведама, ўвайшоў у блёк з жыдоўскімі фабрыкантамі і сыяністамі, падараваўшы *няма ведама дзеля чаго* (!) ажно тры мандаты ад Віленшчыны літоўцам!

Гэты камітэт выстаўляе гэткіх кандыдатаў на паслоў: першым ідзе Ярэміч, потым Рагуля, далей Багдановіч, Стэповіч, Куніцкі, сьвяшчэнік Голад і Сьвістун.

Усе мейсцы на мандаты і прыпушчальныя і нават безнадзейныя раздадзены *сваім* сель-саюзьнікам.

А што-ж застаецца вёсцы? Якіх кандыдатаў сялянскія паветы будуць праводзіць?

Але гэта было-бы поўбяды, калі-б толькі гэтых сельсаюзьнікаў павінны былі праводзіць у Сойм беларускія выбаршчыкі.

Зусім не!

Амаль ня ўсюды на другіх, а то і на першых мяйсцох чыста беларускіх паветаў стаяць жыды. Гэтак з Лідзкага вокруга (паветы Лідзкі, Валожынскі, Ашмянскі, Маладэчанскі і Віленскі) на першым мейсцы ідзе здраднік ех-грамадавец Сабалеўскі, а на другім жыд. У Вільні, разам з паветам Швенска-Троцкім, на першым мейсцы жыд і г. д. і г. д.

Гэтак ідуць на выбары, разьлічаючы на *сялянскія галасы*, Ярэміч — Рагуля!

Як пойдзе Грамада, пакуль невядома. Відаць гэтак-жа, як і Сельсаюзьнікі, ў блёку, але ўжо беларуска-польска-жыдоўскім, зложаным з элемэнтаў камуністычных. Гэтая група арганізуецца пакуль што каля „Права Працы" і „Думкі Працы".

Сьпісак гэты калі і будзе мець пасьпех па гарадох сярод пралетар'яту, дык сярод сялянства мець пасьпеху ня будзе.

Трэцяя беларуская група — гэта наша, якая, высока падняўшы свой штандар, выступае *чыстым беларускім сьпіскам.* Нашая група *шырока адчыніла дзьверы для сялянства.* Нашая група дае магчымасьці паветам выставіць *сваіх кандыдатаў*—шчырых, сьвядомых, праўдзівых сялян. Мы *сваіх* сьпіскаў яшчэ не састаўлялі. Сам народ скажа, каго ён хоча на паслоў. Скажа на тых паветовых і акружных зьездах, якія ў хуткім часе склікае „Цэнтральны Беларускі Народны Выбарны Камітэт".

Дык Беларусы! Ведайце, што адзіным *Вашым* камітэтам ёсьць той, які будзе праводзіць ня жыдоўскіх банкіраў, фабрыкантаў і сыяністаў альбо камуністычную міжнародовую нечысьць, за якую потым зноў будуць цягаць сялян выбаршчыкаў па турмам, — але той, які дасьць *Вам Вашых сялянскіх мяйсцовых паслоў!*.

БЕЛАРУСЫ ВЫБАРШЧЫКІ!

Напамінаем, што ад 2 да 15 бягучага месяца у Выбарных Камісіях кожнага абводу будуць выстаўляны дзеля спраўджаньня сьпіскі выбаршчыкаў. Кожны выбаршчык мае права праглядаць гэтыя сьпіскі і спраўдзіць, ці ён ўнесяны, ці не.

Калі хто ня ўпісаны, павінен падаць заяву аб гэтым Камісіі абводовай і прасіць аб упісаньні.

Згодна з арт. 35 п. 4 Уставу Выбарнага можна падаваць гэткія заявы („reklamacje") ня толькі аб сабе, але і аб другіх (знаёмых, кроўных), няўнесяных у сьпіскі.

ФОРМА REKLAMACJI.

Да Камісіі Выбарнай абводу у ....

Грамадз. ....

З вёскі ....

Рэклямацыя.

У сьпіскі выбаршчыкаў у Сойм і Сэнат я (альбо такі-то) чамусьці ня унесяны. Выбарчыя правы я (альбо такі-то), як сталы жыхар сваёй вёскі і грамадзянін Польскае Рэспублікі маю. Правоў не пазбаўлены.

Дзеля гэтага, згодна з арт. 35 Уставу Выбарнага, заяўляючы аб гэтым прашу Камісію дапаўніць сьпісак унясеньнем у яго мяне (альбо такога-та).

Дня .... (Подпіс) ....

Гэтыя рэклямацыі падаваць можна у працягу 42 дзён ад дня аб'яўкі аб выбарах (г. е. ад 6 сьнежня). Рэклямацыі, згодна з языковымі законамі з 1924 году, можна падаваць у беларускай мове. Рэклямацыі, апроч пісьменных, можна рабіць і вусна, але тады аб гэтым дзяжурны сябра Выбарнай Камісіі павінен аб гэтым сьпісаць пратакол.

Грамадзяне! Спраўджайце сьпіскі!

Гэта Ваш найпершы грамадзкі абавязак!

Памятайце, што кожны ня ўпісаны ў сьпіскі выбаршчык — гэта патрачаны дарма голас!

ЦЭНТРАЛЬНЫ АГУЛЬНА-БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ВЫБАРНЫ К-Т.

Палітычны агляд.

Найбольшымі падзеямі мінуўшы год адзначыўся ў Радавай Расеі і Азіі. Цяпер ужо для ўсіх стала зусім ясна, што

Радавая ўлада ў Расеі ўступіла ў перыяд самаліквідацыі.

Трваласьць усякай дыктатуры пэўнай партыі выражаецца ў адзінстве і ўнутранай дысцыпліне гэтае партыі. Бальшавікі добра гэта ведалі і ўсімі спосабамі стараліся падтрымаць адзінства і дысцыпліну камуністычнае партыі. І пакуль жыў Ленін, карыстаўшыйся неабмежаваным аўтарытэтам, гэта адзінства магчыма было падтрымаць. Трэба яму было толькі сказаць сваё аўтарытэтнае слова, як заціхалі ўсе галасы пратэсту і незадаволеньня паасобных партыйцаў. Але ён ня вытрымаў і з яго ўходам з палітычнае арэны ўсе зьвязвалі пачатак канца камуністычнай улады ў Расеі. Некаторы час бальшавікі яшчэ трымаліся, стараючыся ня ўступіць на той шлях, які яму вызначаны гістарыяй, але гэта аказалася вышэй іх сілаў. І ласьне у мінуўшым годзе пачаўся раскол і распаўзаньне камуністычнае партыі. Ня гледзячы на тое, што гэта пагражае катастрофаю для ўсяе партыі, правадыры яе распачалі самую заядлую барацьбу між сабою, на якую 95% маса расейскага народу толькі пагля дае з боку і чакае на момэнт, калі можна будзе выступіць актыўна і зьмясьці з паверхні зямлі гэты бруд.

Выкінутымі з партыі апынуліся найбольш выдатныя дзеячы камуністычнае партыі, як Троцкі, Каменеў, Зіноўеў, Радэк, Ракоўскі, Лашэвіч і іншыя. Цяпер толькі пытаньне часу, калі-ж нарэшце распачнецца ўзаемнае кравапусканьне, як апошні этап самаліквідацыі бальшавіцкае дыктатуры ў Расеі. А ўсе абставіны, як унутраныя, гэтак і вонкавыя гавораць за тое, што гэты момэнт можа прыйці нечакана ў кожную хвілю. Унутры Расея перажывае гэткі эканамічны крызыс, як у часе гэтак званага „военнага камунізму". У местах зноў адчуваецца вострая нястача ўсялякіх прадуктаў. Перад крамамі і коопэратывамі зноў паявіліся безканечныя вочарадзі (хвасты), як у 1918—19 г.

А з другога боку

вонкавыя абставіны складаюцца толькі на некарысьць бальшавікоў.

Пасьля разрызу адносінаў з Англіяй і поўнага фіяско перагавораў з Францыяй бальшавікам сужана было пераканацца на сваёй уласнай скуры ў поўным правале іх пляну навязаць кантакт з акружаючым сьветам пры пасрэдстве Лігі Народаў. Іх першае выступленьне на эканамічнай конфэрэнцыі і затым на другой конфэрэнцыі аб разбраеньні ў Жэнэве закончыліся поўным правалам. Заходняя Эўропа і наагул увесь культурны сьвет аднёсься да правакацыйных выступленьняў бальшавіцкіх агітатараў на міжнародовай арэне зусім нэгатыўна, пераканаўшыся ў тым, што з бальшавіцкаю Расеяю нельга супрацоўнічаць на якім колячы тэрэне. І як першы вынік гэтага аканчальнага разчараваньня ў бальшавіках на дзесяты год іх істнаваньня зьяўляецца поўная адмова ім у грашовай запамозе, без чаго яны фізычна ня могуць істнаваць.

Але аканчальна іх дабіла

кітайская катастрофа.

Пакладаючы ўсе свае надзеі на Кітай бальшавікі дачакаліся таго, што іх адтуль вытурылі аканчальна. Пасьля ўдару, нанесянага Чанг-Тса-Лінам у Пэкіне, бальшавікі яшчэ мелі палудновы Кітай пад сваім уплывам, дзе маглі найбольш шкодзіць Англіі і Амэрыцы. Але Кантонская рэвалюцыя аканчальна вывяла кітайцаў з цярплівасьці і яны адказалі бальшавікам гэткаю крывавую лазьняю, якой яшчэ сьвет ня бачыў. Камуністыя забіваюцца на вуліцы без усялякага суда і расправы, як шалёныя сабакі Усе радавыя консульствы зьліквідаваны і высланы з кітайскай тэрыторыі. Адносіны з Масквою зарваны І ўвесь Кітай, як Паўночны, так і Паўднёвы звольніўся аканчальна ад усякага ўплыву Масквы. Гэта абставіна падалье, бязумоўна, яшчэ больш масла ў унутраную міжпартыйную барацьбу маскоўскіх дыктатараў і ўскорыць пачаўшыся працэс самаліквідацыі камунізму ў Расеі.

Калі цяпер скіруем свой ўзрок на Заходню Эўропу, наступіўшы 1928 г. можа прынясьці вельмі паважныя зьмены ў яе палітычным устасункованьні і ўзаемаадносінах. Перш-на-перш

у гэтым годзе адбудуцца новыя выбары да парлямэнтаў Нямеччыны, Францыі, Англіі і Польшчы.

А прыняўшы пад увагу тое, якую ролю іграюць парлямэнты ў гэтых дзяржавах, можна чакаць вялікіх перамен у выніку тых ці іншых рэзультатаў парлямэнцкіх выбараў. Першы пачатак ў гэтым паложыць Польшча, вынікі выбараў якой да Сойму абяцаюць быць вельмі цікавымі. Наступнаю па чарзе ідзе Францыя, ў якой вызначаны выбары на 22 красавіка. Вынікі францускіх выбараў могуць аказацца дэцыдуючымі для далейшай судзьбы Эўропэйскага міру, калі прыняць пад увагу, што Францыя зьяўляецца галоўным дыктатарам Эўропэйскага міру. У залежнасьці ад таго, хто пераможа ў Францыі— левы, ці правы блёк—залежыць і далейшая судзьба вэрсальскага трактату, ўзаемнаадносінаў з Нямеччынаю, Радаваю Расеяю і г. д., бо францускія сацыялістыя і радыкалы кірунку паноў Эрыё і Каиё даўно стаяць за згоду з бэрлінска-маскоўскімі хаўрусьнікамі.

Гэта-ж самае можна сказаць і пра Англію. Што-ж датычыць Нямеччыны, дык яна суцэльна падпарадкуецца вонкавым абставінам. Калі толькі ва Францыі пераможа левы блёк, дык немцам карысьней будзе гуляць у дэмакратызм, каб шляхам мірных перагавораў дабіцца аканчальнага звальненьня акупіраваных вобласьцяў, зьмены пляну Давуса, аб чым ужо паднялася гутарка і аканчальнай ліквідацыі вэрсальскага трактату. І калі-б толькі дасягнулі гэтых мэтаў, тады толькі паказалі-бы свае пазуры.

N.

З жыцьця нашых арганізацыяў „ПРАСЬВЕТА".

Аматорская трупа вандроўнага тэатру пры Лебедзеўскім аддзеле „Прасьветы" пад кіраўніцтвам Сьвірыды выехала ў аб'езд па Вялейскаму і Маладэчанскаму паветам. Першы спэктакль быў наладжаны ў Беніцы 7 студзеня. Затым адбудуцца спэктаклі ў Вялейцы, Красным, Гарадку і Сморгонях.

Гэтая трупа пры сваім аб'ездзе будзе закладаць тэатральныя аматарскія трупы з мейсцовых сілаў, даўшы ім патрэбныя ўказаньні.

Беларусы! Складайце дэкларацыі.

Цэнтральны Агульна-Беларускі Народны Выбарны Камітэт.

На конфэрэнцыі прадстаўнікоў беларускіх палітычных і грамадзкіх арганізацыяў, якая адбылася у дні 26 і 27 сьнежня г. г. у Вільні, зарганізаваны

ЦЭНТРАЛЬНЫ АГУЛЬНА-БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ВЫБАРНЫ КАМІТЭТ.

Да Камітэту увайшло 5 сябраў з цэнтру і 30 з правінцыі, з якіх 20 зьяўляюцца раднымі. Камітэт распачаў сваю дзейнасьць і працуе ад 9—20 гадзіны. Прыяжджаючыя сябры з правінцыі могуць затрымацца і пераначаваць у памешканьні Камітэту.

Адрэс: Вільня, Завальная 6 — 4.

Перад выбарамі да Сойму і Сэнату.

Выбарны календар.

15 студня. Апошні дзень праверкі выбаршчыкамі апублікаваных выбарчых сьпіскаў.

16 студня. Апошні тэрмін для падачы да Акружной выбарчай камісіі заявы аб неўнясеньні каго — небудзь ці неправідловым унясеньні каго — небудзь у выбарчы сьпісак

22 студня. Апошні тэрмін на падачу запярэчаньня проці зробленых заяваў аб выключэньні каго — небудзь са сьпіску.

24 студня. Паддача дзяржаўных сьпіскаў кандыдатаў.

26 студня. Участковыя выбарчыя камісіі атсылаюць да акружных камісіяў па два экзэмпляры выбарчых сьпіскаў.

30 студня. Участковыя выбарчыя камісіі прыймаюць дадатковыя запярэчаньні проці выключэньня каго — небудзь з выбарчага сьпіску і перасылаюць іх да акружных выбарчых камісіяў.

АБВАДОВЫЯ ВЫБАРНЫЯ КАМІСІІ У ВІЛЕНСКІМ ВАЯВОДЗТВЕ.

У Віленскім ваяводзтве адчынена 512 абвадовых (раённых) выбарчых камісіяў:

63 выбарчы вокруг: м. Вільня — 58, Віленскі-Троцкі пав. — 95.

64 выбарчы вокруг: Сьвенцянскі пав. — 51, Браслаўскі — 87, Пастаўскі 36, Дзісьненскі — 70.

65 Лідзкі выбарчы вокруг: Ашмянскі пав. — 36, Вялейскі 48, Маладэчанскі — 81.

КЛОПАТЫ п. ГРЫНБАУМА.

Створаны быўшым жыдоўскім паслом Грынбаумам блёк нац. меншасьцяў трашчыць па ўсім швам. Ен не абнімае нават аднэй чверці тых сілаў, якія меў у 1922 г. У блёк не вайшлі сацыялістыя нямецкія, жыдоўскія і украінскія, беларуская грамада, украінская сель-работніцкая партыя, частка сыяністаў на чале з д-рам Рэйхам, артодоксы, жыдоўскія нарадоўцы Прылуцкага і іншыя. Нават адзіная з украінскіх партыяў увесь час хістаецца, зауважыўшы, што абмылілася ў сваіх рахунках.

Няудача перагавораў між Бундам і Поалей-Сіёнам.

Перагаворы між жыдоўскімі партыямі Бундам і Поалей-Сіёнам, якія, як ведама, адмаўляліся ўступіць у блёк нац. меншасьцяў, па пытаньню аб стварэньні агульнага выбарчага сьпіску не далі ніякіх вынікаў. Поалей-Сіён жадаў сабе другога мейсца на будучым сьпіску кандыдатаў да Сойму, між тым, як Бунд, захаваўшы для сябе першыя два мейсцы, згаждаўся толькі на трэцяе. У зьвязку з няудачаю гэтых перагавораў належыць лічыцца з магчымасьцю стварэньня новага самастойнага выбарнага сьпіску Поалей Сіён.

ВАЛЫНСКІЯ ЖЫДЫ ПРОЦІ БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯЎ.

У канцы папярэдняга месяца ў Луцку адбыўся зьезд прадстаўнікоў рожных жыдоўскіх гаспадарча-грамадзянскіх арганізацыяў, на якім была вынесена ўхвала проці прыняцьця ўдзелу ў блёку нацыянальных меншасьцяў.

ЖЫДЫ і ЛІТОЎЦЫ НА ПЕРШЫМ МЕЙСЦЫ.

Паводле газэтных вестак на першым мейсцы выбарнага сьпіску Ярэміча—жыдоўскага блёку нацыянальных меншасьцяў фігуруе жыд Выгодзкі, на другім — прадстаўнік літоўцаў — д-р Ольсейко. У паветах Сьвенцянскім, Горадзенскім і Лідзкім на першым мейсцы фігуруе літовец д-р Ольсейко.

А дзе-ж беларусы?...

БЕЗПАРТЫЙНЫ КАМІТЭТ СУПРАЦОЎНІЦТВА З УРАДАМ.

3 студня зарганізаваўся ў Вільні грамадзянскі камітэт выбарны пад назваю „Bezpartyjny Komitet Współpracy z Rządem". Да гэтага камітэту ўвайшлі Partja Pracy, Związek Naprawy Rzeczypospolitej, Związek Rolników Ziem Wschodnich і іншыя.

ЗДАЮЦЦА БЯЗ БОЮ.

Паводле газэтных вестак польскія эндэкі ня будуць выстаўляць сваіх сьпіскаў на Усходніх Крэсах пры выбарах да Сойму. Гэта значыць складаюць аружжа бяз бою.. Прайшоў той час, калі можна было баламуціць цёмныя масы усялякімі абяцанкамі. Добра зрабіло бы, калі б пасьледавала гэтаму прыкладу і Вызваленьне на нашых землях...

ПАЛІТЫЧНЫЯ БАНКРУТЫ ЗА ПРАЦАЮ.

Абанкруціўшыся дашчэнтна пасьля 1922 г. правадыры Вызваленьня, каб зноў як небудзь пралезьці да Сойму, прыбягаюць да усялякіх спосабаў ашуканства, не шкадуючы грошаў. Яны пачалі распаўсюджываць у дзесятках тысячаў адозвы ў беларускай мове у Віленскім, Наваградзкім і Беластоцкім ваяводзтвах, заклікаючых беларускіх сялян, каб падтрымлівалі „адзіную, дбаючую аб іх судзьбе партыю, якою зьяўляецца Вызваленьне". У гэтай адозве між іншым робяцца гэткія абяцанкі: „Зямля бязплатна для сялян", „аддзяленьне царквы ад дзяржавы" і г. д.

Калі хто з вызваленскіх наймітаў сунецца з гэтымі адозвамі, поўнымі рожных абяцанак, у сялянскую хату, дык павінен спаткаць запытаньне: „а дзе-ж вы, паночкі, былі да гэтай пары? Што вы зрабілі з сваіх папярэдніх абяцанак?".

Не, паночкі, годзе ужо ашуківаць сялян рожнымі абяцанкамі, схаваўшы сваё воўчае вобліча ў авечай шкуры! Сяляне вас добра раскусілі.

МЕНСК РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫБАРАЎ У СОЙМ.

У канцы мінуўшага месяца ў Менску адчыніліся курсы выбарных інспэктараў і агітатараў да польскага Сойму і Сэнату. На гэтых курсах чытаюць лекцыі быўшы пасол Кахановіч, Жаўрыд, Каліноўскі і брат быўшага сэнатара Багдановіча. Акончыўшы гэтыя курсы агітатары будуць высланы на усходнія ваяводзтвы Польшчы для перадвыбарчай бальшавіцкай агітацыі.

Апошнія навіны.

З ПОЛЬШЧЫ.

Ураджай 1927 г.

Паводле аканчальных аблічэньняў Галоўнага Статыстычнага Ураду ўраджай галоўных збожаў у Польшчы за 1927 г. прадстаўляецца у наступным відзе: сярэдні ураджай з гэктара ў цэнтнэрах пшаніцы — 13,0, жыта — 11,6, ячменя 13,2 і аўса — 13,0.

Агульны збор гэтых збожаў наступны: пшаніцы — 14,759 тысяч цэнтнэраў, — ячменя — 16,342 т., жыта — 56,884 т. і аўса—33,900. Лічбы гэтыя меншыя, чым падаваліся раней паводле часовых аблічэньняў, дзеля таго што толькі пасьля малацьбы можна было дакладна аблічыць. У параўнаньні з мінуўшым годам збор гэтага году складае у процэнтах: пшаніцы 115,2%. ячменя—1051%, жыта — 113,5% і аўса — 111,2%.

У аднашэньні да даваенных ураджаяў збор гэтага году складае: пшаніцы — 87,9%, жыта — 99,6% ячменя — 109, 82 і аўса 120,5%.

„Палітычная" акцыя Францішка Умястоўскага.

10 месяцаў назад пачала выхадзіць у Вільні газэта, пасьвечаная гаспадарча-фінансавым справам—„Беларускі Дзень" пад рэдакцыяй Ф. Умястоўскага. Газэта рэдагавалася добра, парадаў гаспадарчых давалася даволі і ўсё было добра. Але няшчасьце заключалася ў тым, што рэдактар „Бел. Дня" 20 (двацацаць) гадоў таму хварэў на г. з. „палітычную хваробу". А добра ведама, што гэтая хвароба вельмі трудна вылечваецца, і вось з панам Умястоўскім прыключыўся рэцыдыў—ён зноў „захварэў".

Больш яго ўжо не задавальняла ні падвойная пэнсія, ні ганаровае становішча рэдактара—нішто! Захацелася быць палітыкам!

І трэба прызнаць, што нядаўні пабожны, спакойны і ціхі акцызьнік выказаў шмат энэргіі і руху. Пачалося з таго, што пан Умястоўскі выдаў два нумары „Культуры", дзе, вылаяўшы ў шчэнт іншыя беларускія групы, а асабліва адзіную лёяльную да Дзяржавы і Ураду беларускую групу п. Паўлюкевіча, разрэклямаваў сябе. Праўда *адным адзіным дадатнім фактам* у гэтай аўтарэкляме было тое, што 20 (!) гадоў назад Ф. Умястоўскі рэдагаваў „Нашую Ніву". Аказалася, што нават у гэтым *адзіным* факце пан Умястоўскі быў ня тым, кім ён сябе рэклямуець. Бо нядаўна ў „Працы" былі зьмешчана два пісьмы тагачасных сьведкаў, якія сьцьвярджаюць, што п. Умястоўскі фактычным рэдактарам „Нашай Нівы" ня быў, а быў толькі г. з. зіц-рэдактарам. Праўда Ф. Умястоўскі запярэчваў аднаму з гэтых пісьмаў, але другога пісьма, наданага вядомым беларускім археолёгом – п. Земкевічам, не спраставаў! Цікава адзначыць, што Земкевіч па сваей ідэолёгіі беларускі народнік — полёнофіл!.

Потым пан Умястоўскі аб'яўляе „urbi et orbi", адчыняе якуюсь культурную арганізацыю „Культуру" — Арганізацыя гэтая не радзіўшыся „ўмэрла"!...

Прабуе на гвалт ўбіцца ў Віленскую Беларускую гімназію, прэтэндуючы на пасаду дырэктара... Ветліва, але вельмі цьвёрда туды... не дапускаецца!...

Нарэшце, страціўшы апошнюю надзею як небудзь убіцца ў беларускае культурнае жыцьцё, якое яму 20 гадоў было чужым, — пан Умястоўскі кідаецца з маста ў ваду: — творыць палітычную арганізацыю!..

„Прытчай во языцэх" сярод беларускага грамадзянства быў знаменіты ягоны „зьезд чытачоў і прыхільнікаў" „Бел. Дня" у ліку аж... 19 асобаў! Але што-ж гэта былі за асобы! Гэткіх у дзень і прылічнай публіцы паказаць нельга! Дый пан Умястоўскі гэтак іх і не паказаў і ў „Дні" не напісаў! Так і да гэтага часу афіцыяльна невядома, хто быў на конфэрэнцыі. Але найбольш цікава тое, што нават рэзалюцыяў конфэрэнцыі не аб'явілі! Бо ўхваляны былі гэткія, што і аб'явіць было нельга, напрыклад, уся зямля сялянам бяз выкупу!...

Пасьля гэткай конфэрэнцыі зразумеўшы добра, што грунт зусім ужо заварушыўся пад нагамі, пан Умястоўскі здаўся на капітуляцыю і, зрабіўшы на пачаканьню „кангрэс" партыі (на якім было ўжо ажно... 18 чалавек!), растварыўся ў краёвым „Zjednoczeniu." Краёвае „Zjednoczenie" разьлічае на пэўныя сымпатыі беларусоў, на якія паводле самайідэі краёвай і магло-бы разьлічыць. Аднакжа лічым, што акурат з тых прычынаў, што да „Zjednoczenia" пайшла група Умястоўскага, сярод беларусоў „Zjednoczenie" пасьпеху мець ня будзе. Бо тыя беларусы, якія граюць палітычную ролю ў групе Умястоўскага, з рухам беларускім, альбо нічога супольнага ня мелі, альбо мелі, але на ідэолёгічных падставах дыамэтральна праціўлежных краёвасьці.

Гэтымі асобамі — кітамі групы Умястоўскага — зьяўляюцца Гурын, Міткевіч і Цяўлоўскі.

Праўда Міткевіч, разумеючы, што з Умястоўскім на беларускую вёску *падчас выбараў* выяжджаць нельга ўжо, ад яго адкінуўся, але сувязь і прыяцельскія адносіны Умястоўскага з Міткевічам (выключна да спатыканьняў з пацалуямі на станцыі!) усім ведамы. Хто такі Міткевіч, два папярэдніх нумары нашае газэты зусім выразна акрэсьлілі, як прайдзісьвета і чалавека з крымінальнай мінуўшчыняй!

Пан Цяўлоўскі — другі кіт групы Умястоўскага — ёсьць асобай ня менш колёрытнай, чым Міткевіч. Быўшы бальшавіцкі матрос, потым, „радлюдовец", потым „стражкрэсовец", потым горадзенскі „актывіст", потым супрацоўнік Фёдарава (бальшавіцкага шпіёна, які сядзіць у турме!) і нарэшце чалавек без асобых заняткоў у Баранавічах—Цяўлоўскі ёсьць паўнамоцнік Умястоўскага на Навааградчыну!

Нарэшце трэці кіт — „правая рука" і „палітком" групы Умястоўскага — гэта Гурын.

Ягоная кар'ера зусім ужо галаваломная. Гэта ня больш, ня менш, як быўшы рэдактар „Савецкай Беларусі" і сябра Цэнтральнага Камітэту камуністычнай партыі Заходняе Беларусі, які пасьля арышту і поўнага разгрому гэтай партыі польскай уладай, „праканаўся" і зрабіўся „шчырым палянафілам" групы Умястоўскага.

Праўда ў Горадні ён за гэтае раптоўнае „праканаsuccesьне" (як кажуць па прыгавору быўшай партыі) атрымаў некалькі рэвальвэрных куляў, але выжыў і вось цяпер зьяўляецца другім лідэрам (фактычным!) групы Умястоўскага.

Умястоўскі апошні час сыстэматычна травіць нас, робячы нам закіды і ў немаральнасьці, і у няшчырасьці, і у расейшчыне, і у манархізме і г. д., і г. д, кажучы, што ўсе нашыя арганізацыі — групка асобаў, якія ўсюды фігуруюць. Гэта тагды, як Т-ва „Прасьвета" лічыць 119 аддзелаў, Камітэт па справам Самаўрадаў 200 сябраў і Б. Н. Р. і Партыя — больш 2.000 сяброў. Робіць гэта несумлі́ўна і нягоднымі способамі, прэтэндуючы на асаблівае даверра да ягонай групы, як з боку сваей шчырай палёнофільскай ідэолёгіі, так нават з боку магчымасьцяў уплываў сярод беларускага насельніцтва.

Думаем, што тыя групы польскага грамадзянства, якія *фактычна і шчыра* хацелі-бы згоды і *супольнай працы* з Беларускім Народам, павінны былі бы зразумець, што праз гэтую беларускую „полёнофільскую" групу, як вышэйпаданая, польскае грамадзянства можа ня толькі асягнуць нэгатыўных рэзультатаў, але угробіць самую ідэю краевасьці.

Што датычна таго, якую вагу і значэньне мае акцыя Умястоўскага ў беларускім грамадзянстве, яскрава сьведчыць факт поўнага байкоту акцыі Умястоўскага усімі беларускімі групамі, бо да яго літэральна ані водны з беларускіх дзеячоў, як культурных, так грамадзкіх і палітычных, апрача вышэйпаданых „кітоў" і пары безработных студэнтаў, не належыць і пэўне-ж належыць ня будзе.

Дык для каго патрэбна гэтая акцыя пана Умястоўскага?

Думаем, што ні для польскага грамадзянства, ані тым балей беларускага. Найлепшым выхадам было-бы вярнуцца пану Умястоўскаму на сваё старае насіжанае мейсца акцызнага чыноўніка, урачыста пакаяцца у сваіх грахох і прызнацца, што узяўся за палітычную працу няўмела, здольнасьцяў і творчасьці ніякай ня выявіў і мусіць з сваім архіўным багажом зноў адыйсьці ў беларускі архіў.

З ЗАГРАНІЦЫ.

НЯМЕЦКІ ВАЕННЫ БЮДЖЭТ.

Антымілітарыстычныя колы ў Нямеччыне ўказваюць на вялізарную діспранотцыю ў ваенным нямецкім бюджэце на цяперашнюю 100,000 армію і армію 1914 г. Гэтак напрыклад, штаб Рэйсхвэра лічыць 982 афіцэры, а ў арміі 1914 г. было толькі 619. Інтэндантура каштуе 5,5 мільёнаў мар, у 1912 г.—4,5 м, артылерыя — 5,5 м., у 1914 г.—2,5 м. Хэмічнае ўзбраеньне каштуе 3 міл. м. і г. д.

ВЫБАРЫ ВА ФРАНЦЫІ.

Выбары да новага парлямэнту вызначаны на 22 красавіка, а другое галасаваньне адбудзецца 29 красавіка.

ШУКАЮЦЬ КАМУНІСТЫЧНЫХ ПАСЛОЎ.

Па загаду гэнэральнага пракурора француская паліцыя распачала пашуканьні камуністычных пасло́ў Кашэна, Марці, Дорыё і Дзюкло, не пажадаўшых сесьці у вастрог пасьля аканчаньня сэсыі парлямэнту і невядома куды схаваўшыхся.

У НІКАРАГУА ЗНОЎ ВАЙНА.

Аэрапляны амэрыканскага ваеннага флёту бамбардавалі рэвалюцыйныя войска нікарагуўскага гэн. Сандзіно. Два батальёны марскіх стральцоў атрымалі загад высадзіцца ў Нікарагуа з мэтаю прыняцьця удзелу у ваенных акцыях проці гэн. Сандзіно

АМЭРЫКА ПАДАРУЕ ЭЎРОПЕ ЧАСТКУ ДАЎГОЎ.

У амэрыканскіх палітычных і фінансавых колах спадзяюцца ў бліжэйшым часе распачацьця перагавораў аб ваенных даўгах і рэпарацыях (кантрыбуцыях) у кірунку зьмяншэньня агульнай сумы, якую Эўропа вінна Амэрыцы і акрэсьленьня аканчальнай рэпарацыйнай сумы, якую павінна выплаціць Нямеччына.

КАМУНІСТЫЧНЫ ЗАМАХ у АМЭРЫЦЫ.

Пад 3-х этажны гмах газэты „Scranton Sun" у Пансільваніі нявыкрытыя злачынцы падлажылі 16 мяшкоў дынаміту. Выбухам гмах разбураны дашчэнтна. Шмат раненых. У замахе падазраваюць камуністаў.

НОВЫ ЦЭНТР КАМУНІСТЫЧНАЕ ЗАРАЗЫ.

У зьвязку з нявудачаю камуністычнай прапаганды у Кітаі бальшавікі рашылі перанясьці цэнтр агітацыі да Індыі і Афганістану.

ВОДГУКІ КАМУНІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў КАНТОНЕ.

Прыбыўшы да Гон-Конга гэнэральны радавы пасол у Кантоне Пахваліскі апавя-

Раяшнік.

(Аб выбарчым календары, што разсылаюць павадыры).

13 сьнежня.

У „бюрах“, дый ў кабінэтах, дый ўсё ў сэкрэтах розныя ўсё камбінацыі, каб раздабыць „асыгнацыі“ на надходзячы час ўжо выборчы, для асабістай палітыкі творчы...

Ад 15 да 25 сьнежня.

Рады, нарады... Зьезды, раз‘езды... Павадырскія лаянкі, спрэчкі, а з Народам ўсе, быццам, авечкі і гэтак і так, абы увайсьці у кантакт...

26 сьнежня.

Новыя ўжо камбінацыі, пакрыху трасуць “асыгнацыі“...

Ад 27 да 31 сьнежня.

Адозвы, газэты... Навакол камітэты... Саюзы, хаўрусы... „Краёўцы—еднаньне“ і быццам усюль аб‘еднаньне, але для поўнага тут вось аккорду „лупяць“ адзін аднаго ўжо ў „морду“.

Ад 2 да 15 студзеня 1928 г.

Каб выбары мелі-бы „зыскі“ не забудзьце, браточкі, спраўдзіць Вы сьпіскі — абвадовыя, усім Вам у гмінах вядомыя і кожны мужчына, а на‘т і кабета ў сваім вось абводзе, хто мае па дваццаць адным ужо годзе, усе, як на „веча“ — хто з лаўкі, хто з печы — зьлязай, дый ўжо ня „зевай“, бо „тэрмін“ прапусьціш і голас упусьціш. Дык ня „дуй“ сабе ў ус, а помні, што ты беларус і толькі твае кандыдаты павінны атрымаць ўжо мандаты, а не нашага краю „мнейшосьці“, што лезуць проста із косьц‘, каб правам Тваім скарыстацца і на карку тваім-жа да Сойму грабрацца.

Дык сьпіскі ўсе разглядай і добра усе „заўважай“ ці ёсьціка тамака Ты, ці ўпісаны і Твае на‘т сваты, і швагер Лявон, і сусед Твой Сымон, і дзяцька Сянюк, і дзяцька Арлюк, і Зоська, Марылька, і цётка Эльжбета, і іншая можа кабета — у сьпіскі яшчэ не папала, дык трэба глядзець, каб ніводнага голасу ужо б не прапала, а як колячы што, дык не чакайце ад нас пракламацыі, а самі складайце ужо рэклямацыі, бо спазьненьне апошнім ўжо „срокам“ — каб усім нам ня вылезла бокам.

Шэйнэ-Катарынка.

дзе, што ў часе арышту ён, яго жонка і дзеці падлягалі рожным катаваньням. Усе служачыя консульства, як расейцы, так і кітайцы растраляны за ўдзел у камуністычнай рэвалюцыі.

2,500 РАСТРЭЛАУ у КАНТОНЕ.

Кантонскія ваенныя ўлады аб'яўляюць, што пасьля ліквідацыі апошняга камуністычнага паўстаньня было растраляна 2,500 кітайскіх камуністаў і 20 савецкіх агітатараў.

Поўны правал Сельсаюзьніцка-жыдоўскага блёку.

28-га сьнежня у памешканьні „апалітычнага“ Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, (Вострабрамская 8) адбыўся зьезд выбаршчыкаў „Цэнтральнага Беларускага „Аб'еднанага „Выбарнага Камітэту“. Мы ўмысна чакалі, што аб гэтым зьезьдзе напіша орган Сельсаюзьнікаў „Сялянская Ніва“, чакаючы з боку „Сель Нівы“ звычайнай маны, замалчваньня няпрыемных фактаў, крыклівай хвальбы і г. д., на што толькі і здатны розныя Сьвістуны, Скаргі і іншае плюгаўства „Сель-Нівы“, якое з сябе робіць “пісакоў“.

І як мы чакалі, так і сталася. Вось красачкі, якія падае „Сель-Ніва“ аб гэтым „зьезьдзе выбаршчыкаў“: перад усім аб самых лічбах зьезду. „Сель-Ніва“ падае, што „дэлегатаў з правінцыі было 100, а запраўды іх было роўненька 60! Скажам больш таго: усе яны начавалі у готэлю „Полёнія“, на Вялікай вуліцы! А даў грошы на выдаткі па зьезду выбаршчыкаў на готэль, дарогу, абеды з гарэлкай для асабліва „блізкіх выбаршчыкаў“, (бо простым гарэлкі не давалі!...), ніхто іншы, як новы саюзьнік сельсаюзьнікаў, абаронца беларускай сялянскай ідэолёгіі і працоўных масаў..: фабрыкант жыд Шэрэшэўскі!... Аб гэтым „Сель-Ніва“ зусім забылася напісаць?... А мы лічым, што „выбаршчыкі“ павінны-былі ведаць *на каго* яны пад кіраўніцтвам Ярэміча будуць працаваць, бо жыдоўскія фабрыканты дарма грошы не кідаюць!

Далей у сваей справоздачы „Сель Ніва“ падае (з мусу перад сваімі новымі панамі!) амаль не цалком красачныя прамовы жыдоўскіх правадыроў — д-ра Выгодзкага і адваката Чэрніхова, якія тлумачылі прысутным карысьці блёку для... жыдоў!...

Далей, „Сель-Ніва“ з павагай піша: Асабліваe значэньне д-р Выгодзкі прыдаў *згодзе* паміж Беларусамі і жыдамі“... „Сель-Ніва“ відаць забылася аб тым, як яна лаяла гэтых-жа жыдоўскіх паслоў за тое, што апошнія укралі два беларускіх мандаты, нарушыўшы *падпісаную* умову і здрадзілі беларусоў у Сойме!...

Гаварыў прамову і прадстаўнік літвіноў, якім блёк абяцаў ажно тры мандаты з Віленшчыны, зразумела галасамі... Беларусоў!

Аднак-жа у віленскіх колах кажуць, што гэтым „смотрам сваіх сілаў“ жыдоўскія сыяністы і фабрыканты засталіся усё-ж ткі незадаволены, бо „выбаршчыкаў“ было вельмі мала, а затым, ня гледзючы на дабраны склад „выбаршчыкаў“ туды трафіла шмат праўдзівых, шчырых беларускіх сыноў, якія пекныя словы прадажнікаў Рагулі і Ярэміча аб карысьцях блёку з жыдоўскімі фабрыкантамі спаткалі вельмі зімна.

Нічога не напісала „Сель-Ніва“ і аб тым, што амаль не *аднагалосна* увесь зьезд ад імя Беларускага Народу (апрача пасьвячоных“ у афэру прадажы Ярэмічам беларускіх мандатаў!) трэбаваў *аб'еднаньня усіх беларускіх партыяў* і *ґрупаў*. Трэбаваў гэтак голасна, што гэты ужо „аб'еднаны“ (з кім?) камітэт зноў кліча да аб'еднаньня ўсе групы, „апрача урадовых“..,

Дык гэта-ж фарысэйства!

Ці-ж Ярэміч хоць пальцам кіўнуў, каб гэткае аб'еднаньне стварыць? Не, ён увесь час таргаваўся і еднаўся у Варшаве з жыдамі! Мала таго, сваім *ганебным* укладам з жыдоўскімі фабрыкантамі, якія прадалі ужо раз у Сойме Беларусоў, аб чым з абурэньнем пісалі гэтыя ж самі сельсаюзьнікі— Ярэміч зачыніў дарогу да паразуменьня з ім іншым групам.

Нарэшце самае цікавае, аб чым „Сель-Ніва“ падала, *перакруціўшы факты* — гэта скандал з новым лідэрам Аб'еднаньня, ех — грамадаўцам Сабалеўскім. Калі гэты здраднік сваей партыі і таварышоў, якога *чамусьці* (?!) аднаго з усіх паслоў Грамады не зачапіла улада (!!), пачаў на зьездзе нахальна нападаць на іншыя партыі і групы, а асабліва на групу п. Паўлюкевіча, дык уся саля пачала шумець, ляскаць крэсламі ад абурэньня і крычэць: здраднік, ганьба!, прадажнік!“, не даўшы зусім гаварыць яму. І саля толькі тады, супакоілася, калі Сабалеўскага прамову спынілі і далі слова прадстаўніку апазыцыі нейкаму селяніну Міхеяву. Міхеяў тады ўжо у вочы кінуў абразу Сабалеўскаму, што гой „здраднік Грамады, здраднік сваіх партыйных таварышоў якія у турме, а ён зноў ловіць мандат!... „Уся саля спаткала словы Міхеяво громам вопляскаў (ня гледзючы на тое, што грошы на паваротную дарогу ня былі яшчэ выплачаны!), ня хочучы больш слухаць здрадніка Сабалеўскага. І толькі пасьля угавораў Рагулі і Ярэміча, якія ўзялі ў абарону свайго новага зьбянтэжанага сябру, Сабалеўскі зноў пачаў гаварыць і апраўдывацца ў сваей вачавіднай подласьці ў адносінах да сваіх калегаў.

Вельмі цікава, што гэты пан зноў (гэта ўжо ў другі раз!) камусьці пагражаў (грамадоўцам?), закончыўшы сваю прамову грознымі словамі: не чапайце мяне, а то і *я скажу*!“

А мы запытаем: *каму і што*? А можа ужо і сказаў? Бо чаму пасол Грамады на свабодзе, а культурнік дырэктар гімназіі Астроўскі у турме?...

Вось якія красачкі былі на гэтым „зьездзе выбаршчыкаў“.

Мы заўсёды казалі, што сельсаюз страціў усе уплывы сярод сялянства. Але мы не спадзеваліся, што пры мобілізацыі ўсіх сваіх сілаў, яны могуць сабраць усяго 60 асобаў з правінцыі, большасьць якіх аказаліся у апазыцыі да сваіх-жа правадыроў. А некаторыя гэтак былі абураны гэтым зьездам, што папрынасілі і аддалі нам свае дэлегацкія білеты. Гэткіх білетаў у нас ёсьць ажно тры! кожны цікавы сельсаюзьнік *з правінцыі* можа спраўдзіць!

Дык ці можа быць сумліў у тым, што будзе з слаўным жыдоўска-літоўска-беларускім сьпіскам на беларускай вёсцы?

Дык беларускія сяляне! Ганіце памялом, качаргой, альбо аглыбляй з Вашых вёсак гэтых прадажнікаў, гэтых гандляроў беларускімі галасамі, быўшых паслоў Ярэміча і Рагулю з іхнім інтэрнацыянальным сьпіскам! За мандаты Ярэміч купіў сабе дом з пляцам (у калёніі калеёвай каля Вільні), а Рагуля некалькі дзесяцінаў зямелькі і сенажаці...

Вось як яны баранілі інтарэсы сялян, крычучы „уся зямля бязплатна сялянству“!

А цяпер, ведаючы, што сяляне іх ужо ня выбяруць, яны запрадалі беларускія галасы жыдоўскім фабрыкантам і сыяністам, якія будуюць жыдоўскія калёніі у Усходняй Беларусі і *рыхтуюцца пачаць каленізацыю ужо нашага беларускага Палесься.* Але дарэмныя высілкі! Дарэмна жыды далі Ярэмічу і Рагуле грошы! Беларусы ня кінуць ані воднага голаса на жыдоўскіх фабрыкантаў!

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

СПАЖЫВЕЦКІ КРЫЗЫС у САУДЭПІІ.

Вялікшыя месты у Рад. Расеі перажываюць страшны спажывецкі крызыс. Перад крамамі стаяць вялізарныя хвасты, як у часе „ваеннага камунізму“. Пачалася шалёная спэкуляцыя спажыўчымі артыкуламі. У Маскве арыштавана больш 100 спэкулянтаў.

ПАГЛЫБЛЕНЬНЕ НЭП-у.

Вызначэньне правага апазыцыянэра Сакольніка (Брыльянта) на становішча камісара гандлю на мейсца Міконяна лічыцца як адзнака звароту ў савецкай гандлёвай палітыцы ў кірунку ліквідацыі манаполіі „Внешторгу“ у заграгічнай палітыцы і большай свабоды для прывазнога гандлю на унутраным рынку.

САБАТАЖ НА ФАБРЫКАХ у САВ. БЕЛАРУСІ.

На фабрыках у Смаленску, Магілёве і Менску сьцьверджаны масавыя акты сабатажу. У многіх выпадках падпаляюцца фабрыкі ці псуюцца машыны. Страты вельмі вялікія.

ЯШЧЭ АДНАГО ВЫТУРЫЛІ.

Начальнік петраградзкага ваеннага вокруга Корн звольнены з займаемага становішча за тое, што не зварачваў увагі на агітацыйную працу апазыцыянэраў сярод петраградзкага гарнізону.

17,000 ЧАЛАВЕК БЯЗ ДАХУ НАД ГАЛАВОЮ.

Спэцыяльная савецкая камісія сьцьвердзіла, што ў часе землятрасеньня падлягло значнаму зьніштчэньню 8,200 дамоў, з якіх 600 зусім разбураны. У адным з мястэчак каля Бахчысарая ўсе дамы зроўняны з зямлёю. Бяз даху над галавою засталося 17,000 чалавек.

ДУШАЦЬ ПРЫВАТНЫ ГАНДАЛЬ.

У Маскве, Туле, Курску і іншых местах робяцца масавыя арышты сярод прыватных гандлёўцаў. На першы дзень Калядаў у Маскве было арыштавана 60 чалавек.

З КАМІСАРАУ У РАБОТНІКІ.

Паводле вестак з Масквы шэрэг прадстаўнікоў апазыцыі, а сярод іх Троцкі, Ракоўскі і Каменеў працуюць на маскоўскіх фабрыках простымі работнікамі. Але трудна паверыць, каб іх прымусіла да гэтага бяда. Ці-ж яны не адлажылі сабе мільёнчыкаў з нагрibленага, як таварыш Красін? Відаць гэта праца ім патрэбавалася для самарэклямы.

РАДЭК ХАЦЕУ УЦЯЧЫ ЗАГРАНІЦУ.

Па чуткам Радэк хацеў уцячы загранiцу, але быў затрыманы Г. П. У. і дастаўлены да Масквы, дзе цяпер знаходзіцца пад строгім надзорам.

КАТ МЕНЖЫНСКІ — КАМІСАР АСЬВЕТЫ.

Быўшы кіраўнік Г. П. У. (чрэзвычайка) Менжынскі займе становішча Камісара прасьветы замест Луначарскага, які вызначаны на пасаду савецкага пасла ў Рыме. Прычынаю ўхода Менжынскага паслужыла непаразуменьне з Сталіным, які лічыць, што акцыя Г. П. У, проці апазыцыі ня зусім адказвае яго жаданьням. Начальнікам Г. П. У. будзе вызначаны адзін з бліжэйшых супрацоўнікаў Сталіна. Вось дык асьвета будзе ў Саўдэпіі пад кіраўніцтвам ката!

ПРАТЭСТУЮЦЬ...

У рожных Радавых местах ладзяцца ўладамі мітынгі, на якіх выносяцца пратэсты проці растрэлу служачых савецкага пасольства ў Кантоне.

УСЯЧЫНА.

Дзяржавамі ў якіх найбольшы лік асобаў канчае самагубствам, зьяўляюцца Вэнгрыя, Нямеччына і Чэха-Славакія. На 100.000 жыхараў у працягу года канчае самагубствам: у Вэнгрыі — 27 чал., Нямеччыне — 26, Чэха-Славакіі — 25, Швайцарыі — 24, Швэцыі — 16, Даніі — 15, Францыі і Італіі — 9, Іспаніі — 4, Грэцыі — 2.

Прэзыдэнт Злучаных Штатаў Кулідж у вялікай прамове ў Філадэльфіі перасьцярагаў Амэрыку аб небясьпецы, якая можа ўзнікнуць дзякуючы цераз'мернаму багацтву. Ен напомніў, што шмат дзяржаваў зьгінула дзякуючы багацтву і няўмеранаму карыстаньню ім.

У Англіі будуецца новы паветраны аэрастат R 100, які будзе мець 1 мільён кубічных футаў абыйма. Гэта будзе найвялікшы паветраны апарат на сьвеце, абыймом у два разы бальшы найвялікшых цэпэлінаў. Для пасажыраў ёсьць пакоі ў 4 этажы, вышынёю у 4-х этажны гмах.

Яшчэ адзін дакумант аб прайдзісьвету Міткевічу.

Паважаны Пане Рэдактар!

Прачытаўшы ў „Самаўрадзе“ № 1 (3) адказ на артыкул, надрукаваны ў „Беларускім Слове“ (№ 29) п. н. „Прайдзісьвет“ датычна асобы „адваката“ Міткевіча, каторы лічыць сябе абаронцам Беларускага Народу, лічу патрэбным давясьці да агульнага ведама адзін з тых спосабаў, якімі „адвакат“ Міткевіч зводзіць сваіх кліентаў, бяручы пры гэтым сколькі ажно можа выдусіць (хоць прадай апошнюю кашулю), а справе паможа, як кашэль хваробе.

Маючы судавую справу, я аддаў яе Міткевічу, каторы запэўніў, што будзе выйграна, адно яму патрэба ня меньш як 100 (сто) рублей золатам. Хаця грошы і атрымаў, але справу „адвакат“ у міравым судзе праіграў і кажа, што будзе напэўна выйграна ў акружным судзе, як атрымае другія 100 (сто) рублей золатам, бо за гэтыя грошы ён дастане ў адваката са стараны праціўнай нейкую паперку, патрэбную да справы і ўсё будзе добра.

Калі ў галаве нічога няма, дык і грошы нічога не памогуць, тым балей, што „абаронца“, атрымаўшы 200 рублей залотам, нават не парупіўся, каб прыехаць на суд як міравы, так і акружны.

Дык вось, браты — беларусы, хто ня ведае гэтага „абаронцы“, той няхай будзе асьцярожны, бо гэткая асоба, як Міткевіч, сапраўды ня мае патрэбы прасіць канцэсіі на „шулерню“, бо ўжо ня трэба лепшага шулера — прайдзісьвета, як ён сам.

З пашанаю

Пашкадаваны.

Ад Рэдакцыі. Дакладны адрэс „Пашкадаванага“ знаходзіцца ў Рэдакцыі газэты.

Тутэйшая хроніка.

— **БЕЛАРУСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ў АРЦЫБІСКУПА ЯБЛЖЫКОУСКАГА.** 5 студзеня віленскі арцыбіскуп Яблжыкоўскі, прыняў беларускую дэлегацыю Жодзішнай парафіі, якая прасіла аб узнаўленьні беларускіх казаньняў у Жодзішным касьцеле, скасаваных кс. Дронічат. Арцыбіскуп згадзіўся вярнуць у Жодзішны касьцёл беларускія казаньні з варункам, што просьбу ў гэтай справе падпіша чацьвертая частка парахвяінаў.

— **АРЫШТЫ ГРАМАДАУЦАУ.** 4 студзеня былі арыштаваны грамадаўцы Я. Шнаркевіч, якога нядаўна выпусьцілі з Лукішак і А. Коўш.

— **Тлумачыцца...** Адным з гумарыстычных эпізодаў на першым паказным зьездзе сельсаюзьнікаў Ярэміча-Рагулі ў прысутнасьці жыдоў, які адбыўся ў Вільні ў памешканьні Інстытуту Гаспадаркі і Культуры 28-29 сьнежня, было тое, што беларускі эсэр Мамонька даў Ярэмічу па твары. Аб гэтым факце было пададзена ў ва ўсіх віленскіх газэтах.

Зусім зразумела. што быўшай „нятыкальнай асобе“ няпрыемна было, калі яго даткнуліся, дый яшчэ гэткім недэлікатным спосабам, хаця можа і зусім заслужана. А тым балей прыкра. што здарылася на вачох блёкавых хаўрусьнікаў — жыдоў. І вось, замест таго, каб на гэта рэагаваць агульна прынятымі ў падобных выпадках спосабамі, манцёр рэагаваў па манцёрскі... Ен вуступіў у расейскай газэце „Утро“ (№ 2) з аткрытым пісьмом, у якім тлумачыцца, што „Мамонька не нанёс яму ніякай абразы ня толькі чынна, але нават і на словах і што ён (Мамонька) быў у нецьвярозым стане“...

Ведаючы добра п. Мамоньку, трудра паверыць, каб ён так-такі ніяк і не рэагаваў (нават слоўна!!!), калі яго выстаўлялі з памешканьня Інстытуту!..

А пры гэтым характэрна тое, што побач з гэтым пісьмом Ярэміча ў тым жа нумары „Утра“ зьмешчана адкрытае пісьмо самаго Мамонькі, які між іншым заяўляе, што „на зьездзе Ярэміч у сваей прамове вельмі рэзка і без усялякіх прычынаў кідаў абвінавачаньні проці групаў і партыяў, якія не салідарызуюцца з палітыкаю блёку нац. меншасьцяў і адначасова не дапускаў на зьезд прадстаўнікоў гэтых групаў..

Калі на цругі дзень зьезду я зайшоў — піша далей п. Мамонька—да канцэлярыі Інстытуту і пачаў раздаваць дэлегатам зьезду сваю часопісь „Покліч“, дык з другога пакою выйшаў Ярэміч і пачаў абвінавачываць мяне ў палітычнай нячэснасьці (defenzywa). Я папрасіў яго спачатку быць асьцярожным у выразах, але Ярэміч прадаўжаў далей размову ў тым-жа тоне і духу і к вялікай маей прыкрасьці я павінен быў нанясьці яму абразу чынна. А калі п. Ярэміч, ня маючы грамадзянскага мужаства рэагаваць на гэта, як усякі ганаровы чалавек, бароначы свой гонар і прабуе затушаваць факт абразы чынна маім нецьвярозым станам, дык я яшчэ раз нанашу яму абразу, абвінавачваючы яго ў ілжы, бо я быў зусім у цьвярозым стане“.

Адсюль відаць, што п. Мамонька зусім „у трэзвым уме і цьвёрдай памяці“ даў Ярэмічу „po pysku“ у яго ўласных апартамантах і на вачох усіх яго саюзьнікаў. А Ярэміч, падобна свайму быўшаму сельсаюзьніку Я. Станкевічу, аблізаўся і ўспакоіўся...

Як для правадыра сель-саюзу, быўшага лідэра пасольскага клюбу і новага кандыдата ў Сойм гэта крышку... не таго!..

Да ўсіх беларускіх жанчын Заходняе Беларусі!

З гісторыі сацыяльна-рэвалюцыйнага руху ведама, што жанчыны ўроўні з усімі заўсёды йшлі ў шэрэгах барацьбітоў за лепшую будучыню, прабіваючы сабе дарогу на грамадзка-палітычным полі.

Сяньня, калі польская Конституцыя ўсім дае роўныя правы на ўдзел у выбарах у законадаўчыя ўстановы — Сойм і Сэнат, ініцыятыўная група жанчын — беларусак на прадвыбарчым сабраньні ўхваліла зьвярнуцца да ўсіх беларускіх жанчын з прызывам прыняць самы дзеяльны ўдзел у наступаючых выбарах, і тым адваяваць сабе законам дадзенае права на пасольскія мейсцы ў Сойме і Сэнаце.

Выконваючы свой грамадзянскі абавязак, мы клічам усіх кабет агульным фронтам ісьці на выбары і дамагацца выстаўленьня кандыдатур жанчын на выбарчых сьпісках, каб праз свае прадстаўніцтва ў законадаўчых установах мець магчымасьць змагацца за сьветлыя ідэалы і лепшую будучыню грамадзка-нацыянальнага жыцьця.

З. Осіповіч.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Клецк.

У „Słowie“ (№ 379) быў зьмешчаны артыкул аб нейкай быццам „рэвалюцыйнай“ працы п. Паўлюкевіча. Адказам на гэты артыкул можа быць ніжэйпаданая заява радных м. Клецка, паданая п. Нясьвіскаму Старасьце. З гэтай заявы відаць, што ніякай рэвалюцыйна-дэмагогічнай працы Паўлюкевіч не праводзіў. Калі-ж рэдактар „Wspólna Sprawa“, які даў карэспандэнцыю у „Słowa“, уважае, што абарона правоў беларускіх радных і наагул беларускага насельніцтва, што зьяўляецца мэтай і сутнасьцю працы Паўлюкевіча у выбарчай акцыі да самаўрадаў, за „рэвалюцыйную“ акцыю, дык гэта справа яго, рэдактара, асабістых паглядаў. Прыемна адзначыць, што п. Нясьвіскі Стараста усе паясьненьні п. Паўлюкевіча узяў пад увагу і абяцаў прозьбу радных прыхільна залатвіць.

Вось гэтая заява:

„Да пана Нясьвіскага Старасты.

Большасьцю галасоў радных нашай воласьці два разы быў выбраны войтам п. Ігнат Дзямянюк, асоба агульна паважная сярод мясцовай люднасьці. На заступніка, таксама два разы быў выбраны культурна-асьветны і грамадзкі дзеяч п. Янка Конон, віцэ-старшыня Związku Okręgowego Kółek Rolniczych у Клецку і сябра Надзорчае Рады Касы Стэфчыка у Клецку, Сэкрэтар Ураду Пажарнай Дружыны у Кухчыцах. На лаўніка у часе другога галасаваньня выбраны быў п. Твароўскі.

Пасьля двухразовага незацьвярджаньня выбраных Радай войта і заступніка яго, п. Старастай быў вызначаны войтам п. Баркоўскі, а заступнікам п. Лобка, які не уваходзіць на'т у склад Рады.

З прычыны таго, што выбары гэтыя розна камэнтуюцца усюды, я, як напр. у газэце „Wspólna Sprawa“ — робяцца зусім безпадстаўна закіды некаторым радным, лічым за свой абавязак перад выбраўшай нас люднасьцю давясьці да ведама п. Старасты ніжэйпаданае.

Будучы бязумоўна лёяльнымі грамадзянамі Дзяржавы з асаблівай пашанай адносімся да маршалка Пілсудзкага і да прадстаўнікоў гэтага Ураду на месцох — не бярэм на сябе сьмеласьці пратэставаць проці не зацьверджаньня нашых выбраньнікаў і вызначэньні войта і заступніка з намінацыі, аднак, у зразуменьні адказнасьці прад нашымі выбраньнікамі, лічым сваім абавязкам ветліва закамунікаваць п. Старасьце, што ніхто іншы, як п. Баркоўскі быў адзінай прычынай паўстаньня антаганізмаў паміж польскай і беларускай люднасьцю. Бо гэтага антаганізму у гміне зусім ня было, ад чым сьведчыць факт папярэдняга выбару п. Баркоўскага войтам галасамі беларусаў, якіх у папярэдняй гміне было ажно 8 з 10.

Выключна праз неадпаведнае выступленьне п. Баркоўскага падчас выбараў, як зьмена абводаў галасаваньня і надзел мандатаў, увядзеньне курыяльнасьці, што мела мейсца у вёсцы Кухчыцах, — увяло непатрэбнае абастрэньне нацыянальных адносінаў сярод мясцовай люднасьці.

На падставе выжэйпаданага ніжэйпадпісаныя радныя Клецкай воласьці — ветліва просім п. Старасту у імя дабра гміны не вызначаць нам на войта п. Баркоўскага“.

Падпісалі:

Аляксандр Мікерэй, Янка Конон, Дземян Рогальчук, Ігнат Дземенюк, Янка Кульбака.

ФАРБАВАНЬНЕ ЛІСЫ.

(*Любча, Навагрудзкага пав.*)

Усім добра ведамы былы пасол Рагуля, які добра нажыўся за час свайго пасламаньня, падбыўшы сабе коштам збаламучаных сялян шмат зямлі і сенажаці у любчанскім маёнтку, загадзя абвясьціў, што 21 сьнежня адбудзецца ў Навагрудку зьезд. Відаць добра жылося пану паслу ў Сойме, калі цяпер усялякімі сродкамі хоча пралезьці да Сойму, каб зноў баламуціць сялян і ў мутнай вадзе лавіць рыбку. І вось адчыніўся 21 сьнежня гэты даўно вызначаны „зьезд“, на які дапушчаліся сяляне толькі па спэцыяльным запросінам. Але сяляне, зразумеўшы, што іх праўдзівым абаронцам зьяўляецца толькі Бел. Нац. Партыя, на „зьезд“ пана Рагулі не пайшлі. Сабралася толькі некалькі асобаў, якіх частаваў гарбаткаю п. Рагуля і якім жаліўся, што людзі ня прыйшлі на „зьезд“ з прычыны „вялікага ветру“...

Пэўне-ж, папочак, вецяр папсаваў, адхіліўшы сялян, толькі не ў твой бок, дзе пахне любчанскім маёнткам! Даволі ужо баламуціць сялян! Набыў зямліцы і заспакойся! Ваша песьня сьпетая...

Любчанскі.

З жыцьця нашае моладзі.

(*Вёска Заельна, Грыцэвіцкае гм.*)

Шмат мы чыталі аб сьвядомасьці нашага гаратнага сяляніна, што ён быцца, адукаваны, што хоць ты бяры ды стаў яго ў адвакаты, калі хочаш справу выйграць. Абрыдла нам ужо чытаць пра гэту яго сьвядомасьць, але-ж і німа магчымасьці вытрымаць, каб не сказаць некалькі слоў аб нашай маладзі ў вёсцы Заельнай. Праўда не скажу, што ўсе, але ёсьць шмат гэткіх, што тым толькі і займаюцца, што ходзяць па вуліцы дый пяюць брандзюшкі, альбо калі заваляцца ў хату, дзе ёсьць дзяўчаты на вячорках, дык тады пакажуць сябе: зьдзекуюцца з дзяўчат, дый ломяць услоны.

Гэта яны робяць замест таго, каб зайсьці да пачытаць кніжку, ці газэціну. А скажы ты яму: „Браце, ахвяруй маленькую суму (5 грошаў) на пашырэньне свайго роднага слова“, — дык ён табе адкажа: „Го! го! го! лепш я за гэтыя грошы куплю дзьве папяросы дый накуруся, дык буду мець лепшую карысьць, чым ад гэтае кніжкі ці газэты“!...

Дык браточкі вы даражэнькія! Кіньце вы гэту агідную працу, лаянкі і брыдкія сьпевы, а лепш вазьміце ды пачытайце кніжку, у якой шмат чаго знойдзеш цікавага для сябе і для апавяданьня другім! Пойдзеш сабе і на вечоркі да дзяўчыны, раскажаш ёй што-небудзь цікавага з прачытанага ў кніжцы, і я, браткі, пэўны, што гэта дзяўчына будзе ў 10 разоў лепш задаволена гэтай гутаркай, чым тым дымам, які ты пускаеш ей ў вочы з папярос.

Ёсьць шмат нашых беларускіх песьняў. Навучыліся-б дый папялі-б замест брандзюшак і было-б надта прыемна слухаць, а стары Міхал ляжаў бы на пячы, слухаў бы і плакаў, як плача маці, сустрэкаючы свайго сына з вайны, аб якім ня было чутак аж дзесяць гадоў і цяпер ён прыходзіць (як наша беларуская мова, якая была закінута за прамудзя) і яна кідаецца яму на грудзі і абліваецца гарачымі сьлязьмі...

Гэтак сама павінны і мы сустракаць сваю родную мову і ніколі яе не забываць.

Недалёкі.

Аб нашым жыцьці.

(*Лужкі Дзісьн. пав.*)

У нас цяпер усе зацікаўлены выбарамі ў Сойм. Няма іншай гутаркі, як толькі аб выбарах і каму аддаць свае галасы. Але сяляне яшчэ дрэнна арыентуюцца ў гэтым дзеле. Наагул можна сказаць, што галасы пераважна сялянскія аддадуцца тым партыям і арганізацыям, ад якіх будзе праведзена моцная агітацыя. Самі па сабе сяляне ні ў якую партыю паліт. ці культур. арган. не запісваюцца, што сьведчыць праява з Лужацкім Інст, Гасп. і Культ., кіраўнікі каторага нават і печаткі гэтага Інстытуту занесьлі і аддалі ў пастарунак паліцыі. Што будзе далей, пакажа будучыня, а цяпер аб чым іншым, болей рэальным.

Пераважна аб самагонцы.

Пішучы гэтыя радкі, хочацца як найхутчэй пахваліцца таварышкам жанчынам, каторыя яшчэ дагэтуль ня ськінулі цяжар, прынасімый у іх ціхае, сямейнае жыцьцё самагоначнай атрутай.

„Сьмерць самагонцы“! Наш лёзунг, ужо зьдзейсьніўся.

Ад пяці ўжо гадоў і болей па сёлах, мястэчках і фальфарках гналі самагонку, пілі яе і ці-ж трэба аб тым пісаць, колькі яна прыносіла беднай сялянскай сямье гора і бяды, а колькі яна прыносіла шкоды ў культурным напрамку!

Няма ведама чым кончылася-б, каб не падасьпеў закон скарбовый. Дзякуючы гэтаму закону спынілася вытворства самагонкі, а пагэтаму перастала на вёсках пьянства. Замест пьяных оргій, сялянская моладзь пачынаець рупіцца аб кніжцэ, газэце. Дзе ёсьць болей культурных сіл, там знаходзяцца аматары, каб наладзіць спэктакль. Напрыклад у в. Ізабэліна праднaзначана на другі дзень Каляд паставіць „Зьбянтэжаны Саўка“ і „Зар. Паўлінкі“. Збор грошаў пойдзе на пацярпеўшых ад паводзінаў. Няведама ці Стараста дасьць дазвол на спэктакль-вечарыну?

За спыненьне вытворства самагонкі ў нашых ваколіцах ад сябе і жанчын, каторыя адчувалі ў ей зло, прынашу беларускае „дзякуй“ меснай паліцыі за зробленае дабро ня толькі ўраду, але і нам беларусам.

Яшчэ раз дзякую!

Яніна.

13-XII-27 г.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Ветліва прашу зьмясьціць у Вашай паважанай газэце наступнае:

У „Бел. Дню“ (N 89) была надрукавана корэспондэнцыя з Баранавічаў, у якой паданы зусім неправідловыя факты пра мяне. Апрача таго корэспондэнцыя на сваей форме і зьместу ёсьць нагэтулькі цынічнай і бульварнай, што міма волі паўстае пытаньне: ці ня ёсьць рэдактар „Бел. Дня“ гэткаю самаю бульварна-бруднаю асобаю, як і ягоныя пісакі—корэспондэнты?

У корэспондэнцыі між іншым робіцца мне закід у тым, што я „сьлесар“. Перадусім гэта няпраўда, бо я фаховец—мэханік і маю сваю ўласную майстроўню, якую здабыў уласнаю шматгадоваю цяжкаю працаю, ў якой і цяпер працую. Працы сваей ня толькі не саромлюся, але нават гаржуся ею і ніколі не параўняю з тэю, якую вядзе на лёгкія грошы рэдактар „Бел. Дня“. Што-ж датычыць майго ўдзелу ў рожных арганізацыях, што я „ўсюды лезу“, як піша „баранавіцкі корэспондэнт“, дык тут гаворыць толькі чыясь дзікая зайздрасьць, бо не я сам лез, а мяне выбіралі!

Праўда, я зьяўляюся радным места Баранавічаў бязупынна з1919 г., начальнікам баранавіцкай агнёвай стражы ў працягу 25 гадоў, начальнікам акружной баранавіцкай агнёвай стражы ад 1926 г., сябрам павятовага баранав. соймiку ад 1922 да 1927 г., у якім быў выбраны сябрам павятовага Wydziału, царкоўным старастаю ад 1919 г., сябрам страіцельнага камітэту па адбудове царквы, сябрам надзорчае рады ў хрысьціянскім коопэратыве „Zgoda“ і старшынёю т-ва хрысьціянскіх рамесьлянікаў Навагрудзкага ваяводзтва. Але ўсе гэтыя становішчы былі выбарныя і ганаровыя, на многіх з якіх мяне перавыбіралі па некалькі разоў. Дык рэдактар „Бел. Дня“, друкуючы ў бульварнай форме корэспондэнцыю аб маіх выбарных становішчах, гэтым самым наносіць абразу ўсім тым, хто мяне выбіраў!.

Але рэдактар „Б. Д“. п. „Умястоўскі відаць не разумее гэтага пры сваёй палітычнай сьляпоце і глупоце. Бо ці-ж мог чалавек культурны і выхаваны паступіць так, як ён: прывітаўшы Першы Зьезд Радных у Вільні і прамучыўшы іх сваёю гадзіннаю аўтарэкламоваю прамоваю, на другі дзень узяў гэтае прывітаньне назад?! Праўда, ягоная прамова нікога не перакапала і да яго нікога не прыцягнула, а наадварот, пасьля гэтага для ўсіх стала ясна, хто такі п. Умястоўскі і якую ен мае вартасьць.

Яшчэ можна было-бы выбачыць, калі-б можна было дапусьціць, што п. Умястоўскі гэта зрабіў па редактарскай памылцы, ці недагляду, ня ведаючы, аб кім падаецца корэспондэнцыя. Але п. Умяствўскі вельмі добра ведаў, аб кім ідзе рэч, бо бачыў мяне на Першым Зьездзе Радных у Вільні, як віцэ-старшыню Зьезду!

Дзеля гэтага я мушу публічна заявіць, што падобныя способы барацьбы з люцзьмі, якія палітычна не прыйшліся па густу п. Умястоўскаму, — лічу ганебным!.

З пашанаю

Ю. Яроцкі.

3-1-28 г.

Паважаны пане Рэдактар!

Буцьце ласкавы зьмясьціць у Вашай газэце наступнае:

Атрымаўшы сяньня пяць экзэмпляраў „Права Працы“ № 6, я прачытаў яе ад пачатку да канца і ў самым канцы знайшоў свае прозьвішча і падзяку за якіясь „інфармацыі“. А дзеля таго, што там-жа знайшоў неправідловыя і брудныя словы на нашага правадыра п. А. Паўлюкевіча, я павінен адкрыта сказаць, што 62 гадовае жыцьцё і „Лукішкі“ давялі мяне да вопыту, цяпер ведаю, як трэба шукаць праўды. Праўда, я належыў да нябошчыцы грамады і з таго часу атрымліваю газэты яе напрамку, раней па 50 экз., пасьля па 25, а ў апошні час па 5 экз. і ніколі не заплаціў ні воднага гроша. Калі да нас прыяжджаў п. Друцкі-Падбярэзкі і я сказаў яму, што я пісаў да Рэдакцыі „Беларускае Слова“, каб падзякаваць рэдакцыю „Права Працы“ за тое, што так доўга шлюць бяз грошаў сваю газэту і каб яны больш ня прысылалі, дык пан Падбярэзкі адказаў: ну што-ж, калі шлюць, дык няхай сабе шлюць, а вы сабе чытайце і разьбірайцеся. І я з гэтым згадзіўся.

Праўда, што за належнасьць да грамады мяне цягнуць да адказнасьці па 102 і 124 арт. К. К., а за адзін артыкул, напісаны ў грамадаўскай газэце, цягнуць да адказнасьці па 532 арт. К. К. і па паведамленьні Міравога Судзьдзі м. Юрацішак ад 4 красавіка 1927 г. за № 33/27 я хаджу на пастарунак па 2 разы ў тыдзень. Колькі разоў я пісаў да рэдакцыі „Працы“ і прасіў парады, але-ж „Праца“, здаецца, на гэтую хваробу ня доктар. Яна можа толькі ўсунуць за краты, над чым і працуе. На маю просьбу даць параду адказу ніколі ня меў, а замест адказу — рахунак за газэту, дзе цяпер нахальна ўспамінаюць аб падпiсцы на гэтую газэту, за якую я хаджу на пастарунак мэльдавацца. І гэтак пакутую не я адзін, а ўсе тыя, хто па сваей памылцы быў прыхільнікам „Працаў“, якія цяпер сядзяць за кратамі ды цягаюцца па пастарункам за мэльдаваньнем.

Беларусы цяперака ня дурні, каб паверыць рожным прайдзісьветам. „Права Працы“ (N 6) адкрыла вочы ўсім. Па іхняй думцы ў передавым артыкуле няма добрых партыяў і арганізацыяў ніякіх, апрача грамады. Усіх лаюць, а толькі сябе хвалюць.

Даражэнькія Беларусы! Кіньце чытаць Вы гэты, бруд „Працы“, бо яна працуе толькі над тым, каб найбольш загнаць за краты несьвядомых людзей.

Дык паны з „Працаў“ па нас носа ня суньце, бо тутака ў нас вас усіх ведаюць добра. Газэтаў можаце прысылаць па больш, бо гаспадаром яны патрэбны для абклейкі сваіх хат на сьвята ды на... папяросы.

Усіх заклікаю да Т-ва „Прасьветы“ і Бел. Нац, Рэды і Партыі, а гэтыя „Працы“, якія працуюць, каб упіхнуць другіх за краты, ганіце ад сябе вон!

ф. Яросмішкі, Юрацішскай гм.

К. Сьветовостокаў.

27-IX-27 г.

Паштовая скрынка.

Я. Тарасэвіч, Л. Шостак, Б. Шутовіч, В. Бандарнюк, М. Бабіч, Я. Кузьміч — газэта высылаецца,

Атрыманы грошы ад: С. Місуна — 1 зл., Я. Сапоцько 1 зл. Пётры Янушэвіч — 1 зл., П. Рудзінскі — 2 зл. А. Ананіч — 1 зл., газэта высылаецца.

В. Кізік. — Высылкі газэты Вам не спынялі. Калі не атрымліваеце, дык па віне пошты: Навядзіце справкі на пошце. Апавяданьне ня была зьмешчана спачатку па тэхнічным прычынам, а затым з таго поваду, што крыху ўстарэла.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.